*Т.І. Борбат*
(Магілёў, Беларусь)

# СПЕЦЫФІКА РЭЦЭПЦЫІ АПАВЯДАННЯ С.ГРАХОЎСКАГА «МАЛЬВЫ»: МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Як празаік С.Грахоўскі пачынаў з нарысаў.[1] І нават большасць апавяданняў першага празаічнага зборніка "Які вялікі дзень", 1966 мелі яўныя прыкметы нарысавасці. Пры наступных перавыданнях некаторыя творы дапрацоўваліся, шліфавалася і ў змененым выглядзе

[1] Грахоўскі С. Брыгада трох // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1932. – № 29. – С. 2 –3.; Грахоўскі С. Горад маладосці. – Мінск, 1960 і інш.

ўвайшлі ў зборнік "Сустрэча з самім сабою", 1988 ("Сын", "Сустрэча з самім сабою", "Тое далёкае лета", "Свае").

Не ўсе апавяданні і навелы, што склалі змест гэтых кніг, бездакорныя ў ідэйна-мастацкіх адносінах. Проза пісьменніка, як і лірыка, выразна адчула на сабе ўплыў тэорыі бесканфліктнасці. У многіх апавяданнях рэчаіснасць прыхарошана; напрыклад, занадта пампезна апісаны энтузіязм будаўнікоў новага горада на Дзвіне ("Які вялікі дзень", "Дзе ўзыходзіць сонца"). Пісьменнік часта не заглыбляўся ў жыццёвыя падзеі, творы выходзілі гучныя і занадта агульныя ("Так і было", "Ну і ашуканцы", "Любою цаною", "Сувеніры"). У іх зашмат прасталінейнага дыдактызму, героі спрашчаюцца, схематызуюцца, абмалёўваюцца адной фарбай, блакітнай або чорнай, яны ці ідэальныя ("Ну і ашуканцы", "Так і было"), ці адмоўныя ("Сувеніры"). "І здаралася гэта тады, калі ён выконваў сацыяльны заказ, пісаў на тэму дня, добра не перажыўшы ўбачанае і пачутае," – слушна заўважыў М.Мішчанчук [2, с. 72].

Аднак большасць апавяданняў С.Грахоўскага (асабліва са зборніка "Сустрэча з самім сабою") пазначана глыбокім псіхалагізмам, у іх пафас гуманізму не дэкларуецца, а вынікае з самой карціны, з развіцця сюжэта і лірычнага пачуцця ("Зялёны агеньчык", "Варнак", "Зімовыя сны", "Галя Карэцкая", "Мальвы", "Рута", "А маці не спіць", "Сын"). Гэтыя творы вызначаюцца займальнасцю сюжэта, кампазіцыйнай завершанасцю, цікавымі характарамі, роздумам над складанымі маральна-этычнымі праблемамі сучаснасці, якія часцей за ўсё раскрываюцца на матэрыяле жыцця вёскі. Зварот да вясковага жыцця сведчыць аб імкненні пісьменніка і ў штодзённым, звычайным знайсці цікавыя народныя характары, паказаць іх духоўную сілу, прыгажосць, мудрасць.

С.Грахоўскаму-празаіку ўласціва пільная ўвага да радавога, "маленькага чалавека", часцей за ўсё занядбанага і закінутага, прыніжанага або пакрыўджанага лёсам і людзьмі. Праявілася імкненне пісьменніка зазірнуць у яго ўнутраны свет і праз яго лёс паказаць і лёс беларускай вёскі, і лёс ўсяго народа.

Іменна гэта назіраем у апавяданні "Мальвы" – адным з лепшых у зборніку "Сустрэча з самім сабою". Твор не пазбаўлены сюжэтна-кампазіцыйных недахопаў, бракуе псіхалагізму, часта замест чаканых сцэн, – проста аповед, голая інфармацыя. І ўсё ж у ім вымалёўваецца выразны і паказальны вобраз вясковай жанчыны Мальвіны. Аўтар праводзіць паралель паміж яе жыццём і кветкамі. Звычайна мальвы цвітуць у жніўні, але ў апавяданні С.Грахоўскага яны выступаюць пад знакам восені. Мальвіна, як і мальвы, расцвіла сваёй асенняй духоўнай красой. Яна, заўсёды заклапочаная і паспешлівая,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"толькі цяпер прыгледзелася, як у вузкім гародчыку буйна расцвілі цёмна-барвовыя вяргіні <...>. Расцвілі мальвы – значыць, не за гарамі восень <...>" [1, с. 136 – 137]. Аднак вобраз мальваў не стаў скразным у творы, як, напрыклад, у "Хаджы Мураце" А.Талстога: дзядоўнік – Хаджы Мурат.

Апавяданне разгортваецца спакойна, павольна. Вобраз Мальвіны ўводзіцца з першых старонак апавядання: на зарэчны выган прыйшла яна па свайго гадаванца Орліка, маладога і прыгожага каня. Ён – вялікае шчасце, радасць гераіні. Магутная і ганарлівая жывёліна слухаецца гэту немаладую пасівелую жанчыну. "Мальвіна верыла, што Орлік разумее кожнае яе слова: калі хваліла і лашчыла, ён цёрся аб яе плячо і выскаляў буйныя пазелянелыя зубы, а ўшчувала – вінавата згінаў галаву і прыплюшчваў вялікія фіялетавыя вочы, ступаў павальней, баючыся гаспадынінага гневу..." [1, с. 113]. І не дзіва. Мальвіна ж выняньчыла Орліка, выкарміла з соскі. А калі маленькае гаротнае жарабятка ператварылася ў дужага і прыгожага каня, аб'ездзіла, прывучыла да хамута і аглабель, сядла і плуга.

У яе, сіраты, жыве ў душы спагада і любоў да тых істот, якія нагадваюць яе лёс. Так, Мальвіна пашкадавала асірацелае жарабятка, у якім адчула нешта бездапаможнае, дзіцячае. І яна выгадавала, выхадзіла яго, як дзіця.

С.Грахоўскі будуе сваё апавяданне так, што сённяшняе жыццё гераіні выяўляецца недалёкім мінулым, падаецца ў скарочаным выглядзе праз успаміны: "Успомніла, як нябожчык дзядзька Андрон гадоў да сарака ўсё падбіраў сабе пару, ды так бабылём і звекаваў. Жыла пры ім аўдавелая сястра Варвара з дачушкаю Мальвінаю" [1, с. 119]. Цікава, што яе ўспаміны дзяліліся не па гадах і важных падзеях, а па конях: "мама памерла, калі яшчэ быў Варанок, вайна пачалася пры наравістым Буяне <...>. Работу ў ашчадкасе пачала, калі даглядала пракурорскага Кодэкса" [1, с. 120].

Праца ў ашчадкасе, на першы погляд, здавалася лёгкай, але не цуралася Мальвіна цяжкай работы, ніколі не сядзела склаўшы рукі. Ёй ад дзядзькі-халасцяка дастаўся "добра дагледжаны дом з садам і гародам амаль у цэнтры мястэчка, хлеў з адрынаю і склепам, выпешчаная малочная карова, кожны год Мальвіна трымала доўгіх, як луты, кормнікаў, вяліся куры і гусі. <...> Словам, была гаспадыня: уставала з пеўнямі, клалася пасля гімна" [1, с. 116 – 117].

Адчуваецца глыбокае веданне С.Грахоўскім жыцця вёскі, яе праблем, нібыта ён увесь час жыў сярод вяскоўцаў, людзей працы. Народнае жыццё паўстае з яго штодзённымі турботамі, гаманой, гаворкай, у формах народнага мыслення і маўлення. "Да Мальвіны ён (Орлік) трапіў *от як*", – заўважае аўтар. Народны погляд на з'явы праяўляец-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ца і ў эпізодзе на хісткім мастку, калі кабыла ляснічага зламала нагу. "А ё-ё-ма-а-ё! Гэта ж гатовая пастка!... Ну, усё. Пішы прапала. Адбегала Сіўка. Во, бачыце, – зламаная. Конскія косці не зрастаюцца. Яны, як шкляныя, – вынес прысуд стары сельпоўскі вазак" [1, с. 115]. Многае – з Палесся, з тых мясцін, адкуль родам сам С.Грахоўскі: "жанкі" [1, с. 113], "жытка" [1, с. 136], "паздароўкаўся", "басата" [1, с. 112] і інш.

Пісьменнік на першае месца ставіць духоўныя, маральныя каштоўнасці ў якасці галоўных крытэрыяў пры вызначэнні годнасці чалавека. Мальвіна – выключная асоба, не такая, як усе. Яна вылучаецца сярод вяскоўцаў перш за ўсё надзвычайнай працавітасцю, любоўю да людзей і жывёл. Яе можна параўнаць з "дзівакамі" В.Шукшына. Яна таксама па-свойму "дзівачка". Але калі ў В.Шукшына даецца самараскрыццё "дзівака", то С.Грахоўскі малюе вобраз Мальвіны па кантрасту ў дачыненні да людзей, якія не вызначаюцца высокай маральнасцю – у параўнанні са Зміцерам, Васілём, медсястрой, "гладкай, як ласіца", да якой унадзіўся Васіль.

Аўтар ставіць вельмі важныя пытанні: што неабходна, каб не загінула чалавечае ў чалавеку, каб не страцілася сумленне, духоўнасць? На гэтыя пытанні С.Грахоўскі імкнецца адказаць, праводзячы супастаўленні, паралелі. У цэнтры ўвагі пісьменніка два лёсы, два характары, пададзеныя па кантрасту – Мальвіны і Васіля. Размова ідзе аб барацьбе высокай духоўнасці з бездухоўнасцю, з мяшчанскай псіхалогіяй. Мальвіне ўласціва шчырасць і адданасць у каханні. Яна ўсім сэрцам пакахала Васіля; праўда, з унутраным "комплексам непаўнацэннасці" ўшчувае сябе: трэба ж урадзіцца такой непрыгожай, такой няззграбнай. Таму з яшчэ большым парывам пахінулася да гэтага прыгожага і статнага хлопца. Яна ўратавала, выхадзіла, дагледзела яго, раненага. Але не адчуваецца сапраўдная душэўная ўдзячнасць Васіля – ён здрадзіў Мальвіне, сышоўся з іншай жанчынай. Выразна пададзены кантраст у асалодах герояў: асалода Мальвы – у працы, у любві да жыцця, да людзей, коней, дзяцей, кветак, а "спецыяльнасць" у Васі, з іроніяй заўважае гераіня, "вузкая – піць, спяваць ды цешыць маладзіц" [1, с. 132].

Яна, кінутая лёсам на адзіноту, сірата, не стала адзінокай. Жыццёвыя няўдачы гераіні кампенсаваны: у яе ёсць сям'я, ды яшчэ якая, – цудоўны сын Толік, які ўвабраў фізічную красу Васіля, але душой стаў падобны да маці. Сына Мальвіна гадавала адна, без дапамогі. Калі ён нарадзіўся, "ніхто на яе брыдкага слова не сказаў, пальцам не тыцнуў, не папракнуў. Хадзіла вясёлая і шчаслівая, а колькі начамі слёз праглынула, ніхто ніколі не дазнаецца" [1, с. 131 – 132]. Хлопец удаўся ўсім на дзіва. А калі нарадзіліся ўнукі, то і далей пабегла яе жыццё з новымі клопатамі і бяссоннымі начамі. Гэта было звычнай справай для



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гераіні: жыць і клапаціцца аб іншых, яе душа хацела больш аддаваць, чым атрымліваць. А вось Васіль асуджаны на адзіноту. Як бачым, Мальва духоўна ўзвышаецца, а ён у сваім духоўным развіцці зніжаецца: "Сам скруціў сабе жытку", – паводле яе вызначэння. Васіль "патроху співаўся, азыз, спахмурнеў, па тыдню хадзіў няголены" [1, с. 132]. Затым выявілася недастача на базе, яго хацелі судзіць, аднак зжаліўся і заступіўся былы камандзір брыгады, "нешта афармілі, нешта скруцілі" [1, с. 132].

Але ж якім бы чулым і спагадлівым ні было сэрца ў Мальвіны, яна не змагла дараваць Васілю яго віну да канца. Аднойчы ён прыйшоў паглядзець на ўнукаў, а Мальвіна яму не дазволіла, хоць і сказала, што ўсё даравала і даўно "слязьмі выпіла боль..." Відаць, нельга дараваць здраду. Аўтар раскрывае высокую прыгажосць працаўніка, які жыве па натуральных спрадвечных законах працы, чалавека, які ўвабраў народную мараль. Тут шмат ад хрысціянскіх традыцый, асвоеных працоўным чалавекам, ад спрадвечнай маралі вёскі.

У творы паказаны канфлікт сумленнага, справядлівага чалавека, прыгожага ў сваёй працы, і людзей, якія спрабуюць выкарыстаць яе ў сваіх эгаістычных інтарэсах, хітруюць, выкручваюцца: "Не бойся, Юстынаўна, – заюліў Зміцер, – усё будзе ў парадку. Усё будзе як часы. Там і работы тае ад сілы на паўдня" [1, с. 121]. А на самой справе ён хлусіць: у ашчадкасу да Мальвіны заляцела яе суседка і паведаміла, што балашоўскі ляснік Зміцер, якому яна дала свайго Орліка для працы на агародзе, прывязаў яго да кузава "газона", каб хутчэй дабрацца да месца. У Зміцера няма спагады да Орліка, ён нават і не падумаў аб тым, што губіць жывёліну. "Ёсць яшчэ выраднкі, што душа тваннню зарасла, а мазгі ад сівухі, як смярдзючы баўтун", – разважае гераіня [1, с. 129]. У роспачы Мальвіна кінулася ратаваць свайго гадаванца і, дарэчы, ледзь паспела гэта зрабіць. Дапамаглі добрыя людзі.

С.Грахоўскі праводзіць думку, што жывёла, якой ты аддаеш сваю пяшчоту, любоў, табе не здрадзіць, як можа здрадзіць чалавек, напрыклад, Вася Мікіцюк – першае і апошняе каханне ў жыцці Мальвіны. Жывёла можа быць больш вернай і надзейнай, чым чалавек.

Значную ролю ў апавяданні адыгрываюць дыялогі. У іх праяўляецца пэўнае адчуванне і людзей, і часу. Зміцер пабойваецца райкомаўскай сакратаркі: калі ўбачыў яе "Волгу", "адразу здрэйфіў".

– Ты што, здурэла, Юстынаўна? – адхіснуўся Зміцер. – Усё ж нармальна.

– Ану, злазь, жывадзёр, – з пенай на вуснах аж заходзілася Мальвіна. – Яму на-рмальна, га?! А хіба ж ты нармальны? – І ў роспачы яшчэ раз ляснула аскабалкам па борце, а сама зайшлася горкімі слязьмі" [1, с. 127]. У парыве эмоцый, у абароне ўсяго жывога праяў-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ляецца рашучы, баявы характар Мальвіны. Яна, па-свойму баявітая, напорыстая жанчына, выпрасіла ў сакратаркі райкома машыну і дагнала тых, хто здзекаваўся з яе Орліка. Вобраз вымалёўваецца ў кранальных праявах: знешняя нязграбнасць жанчыны падкрэслівае яе душэўную прыгажосць. Аўтар падрабязна апісвае кожную рысачку ў абліччы сваёй гераіні: "Шчокі, прыпечаныя сонцам і ветрам, а пад вушамі і на падбародку бледна-жоўтая скура з рысачкамі маршчын, невялікі, востры, як дзюбка, нос, замест шыі, падобнае на гладыш, валлё, тонкія бровы ад пераносся крута спадаюць уніз, рэдкія, гладка зачэсаныя валасы шчодра прыцерушыла сівізна" [1, с. 121].

Неабходна адзначыць, што ў апавяданнях С.Грахоўскага, часам міжволі, на ўзроўні падсвядомасці, праявілася нешта ад паэтыкі рускіх нарысістаў у паказе цягі чалавека да зямлі, роднага кутка. Праўда, у творах Г.Успенскага "ўлада зямлі" прыгнятае, апутвае чалавека. У творах С.Грахоўскага яна ацаляе героя. Пісьменнік, хутчэй за ўсё, працягвае лінію Я.Купалы, яго ідэю, прапушчаную праз вобраз Л.Зябліка, які пупавінай прырос да роднай зямелькі, сваёй хаткі, свайго кутка. Калі адарвеш – загіне. Так і здарылася з Лявонам Зяблікам.

Такім чынам, у лепшых сваіх апавяданнях пісьменнік закранае вострыя маральныя праблемы сучаснасці, праблемы духоўнасці і бездухоўнасці, паказвае маральнае ўзвелічэнне чалавека працы, і наадварот, духоўнае спусташэнне дзялкоў, прагматыкаў, самых розных прадстаўнікоў мяшчанскай філасофіі. Творы прасякнуты пафасам гуманізму, любоўю да чалавека.

**Літаратура:**

1. Грахоўскі С. Сустрэча з самім сабою: Лірычная проза. – Мінск: Юнацтва, 1988. – 316 с.
2. Мішчанчук М. Святло яго душы // На высокай хвалі: Літ.-крытыч. артыкулы / Пад рэд. Д.Я. Бугаёва. – Мінск: Нар. асвета, 1980. – С. 57 – 77.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова